Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 14 (513). Вільня, Нядзеля 2 Красавіка 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл. на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Сьвяткаваньне юбілеяў: 25.III.1918 і „Mužyckaj Praudy“.

Дзень 25 сакавіка беларускае незалежна-арганізаванае грамадзянства сьвяткавала з вялікай урачыстасьцяй. У гэты дзень усе беларускія народныя сілы заўсяды злучае духова адна супольная ідэя Беларускага народу — ідэя Акту 25 сакавіка 1918 г.

Сёлета ў гэты дзень з нагоды 15-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі, гэная лучнасьць духовая беларускіх народных сіл паказала, што ідэя Акту 25.III.1918 пашыраецца і паглыбляецца сярод беларусаў у краі і на эміграцыі.

Беларускае незалежна - арганізаванае грамадзянства Зах. Беларусі сёлета дня 25 сакавіка, разам з юбілеем 15-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі, сьвяткавала і 70-тыя ўгодкі беларускай прэсы.

Дзеля належнага адсьвяткаваньня гэтых двух беларускіх народных юбілеяў, з ініцыятывы Беларускай Народнай Рэпрэзэнтацыі ў Зах. Беларусі — Беларускага Нацыянальнага Камітэту, паўстаў у Вільні агульна беларускі Юбілейны Камітэт, які наладзіў у Вільні ўрачыстасьць гэтых юбілеяў.

Урачыстасьць гэная ў Вільні адбылася ў наступным парадку:

НАБАЖЭНСТВА.

А гадзіне 10 раніцы ў касьцеле сьв. Мікалая кс. Ад. Станкевіч адправіў урачыстую Імшу, падчас якой прыгожа пяяў касьцельны хор. У касьцёл на ўрачыстае набажэнства зышлося ня мала народу, у тым ліку паважаныя госьці-прадстаўнікі Украінскай Парлямэнтарнай Рэпрэзэнтацыі ў Польшчы, прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў, а так-жа і студэнскай корпарацыі „Скарынія“ з сваім штандарам. На заканчэньне набажэнства народ з пад'ёмам духа прапяяў беларускі рэлігійны гімн „Божа, што калісь народы...“, а пасьля набажэнства кс. д-р Рэшаць сказаў адпаведнае да ўрачыстасьці казаньне, якое сваім глыбокім зьместам і стройнай формай сапраўды захапіла слухачоў.

Пасьля набажэнства ў касьцеле, а гадзіне дванаццатай мела адбыцца набажэнства і ў Прачысьценскім Саборы. Аднак аказалася, што ў Вільні спасярод праваслаўнага духавенства не знашоўся беларус. Тады сабраўшыся ў царкве народ прапяяў бел. рэлігійны гымн: „Божа, што калісь народы...“ і разышоўся. Добры гэта прыклад, як трэба абходзіцца народу, у якога запанавалі духаўнікі-чужынцы. Да гэтай справы вернемся яшчэ ў наступным нумары.

АКАДЭМІЯ.

Вялікая заля Віленскай Літоўскай Гімназіі ім. Вітаўта Вялікага, дзе адбывалася ўрачыстая Акадэмія, напоўнена была народам па берагі. Прыбылі на Акадэмію між іншымі прадстаўнікі Тымчасовага Літоўскага К-ту старш. К. Сташыс, кс. праф. Краўяліс, д-р Альсэйка, прадстаўнікі Украінскай Парлямэнтарнай Рэпрэзэнтацыі, паслы: д р Д. Левіцкі, Вахнюк, Загайкевіч і рэдактар „Діла“ Кедрын, а так-жа прадстаўнікі польскага й жыдоўскага грамадзянства.

На сцэне—вялікіх разьмераў Пагоня, а на яе тле—партрэт Кастуся Каліноўскага, артыстычна намаляваныя і гармонійна ўдэкараваныя беларускімі бела-чырвона-белымі сьцягамі, беларускім мастаком П. Сяргіевічам.

За прэзыдыяльным сталом засядае Юбілейны Камітэт: С. Паўловіч, Я. Пазьняк, В. Багдановіч Ф. Ярэміч, В. Тумаш, М. Кепель, Ад. Клімовіч, Ф. Стэцкевіч, кс. Ад. Станкевіч і С. Сарока.

Старшыня Юбілейнага Камітэту С. Паўловіч, адкрываючы Акадэмію, прывітаў гасьцей і ўсіх прысутных кароткай, але стройнай прамовай аб Акце 25 сакавіка 1918 г. і першай беларускай часопісі «Mužyckaja Praŭda», выказываючы значэньне іх у беларускім народным адраджэньні, а так-жа аб слаўнай дзейнасьці беларускага барацьбіта Кастуся Каліноўскага і яго гэройскай мучаніцкай сьмерці за справу Беларускага народу. У часе прамовы старшыня Паўловіч запрапанаваў уставаньнем з мейсц ушанаваць памяць усіх змагароў, на чале з К. Каліноўскім, якія злажылі сваё жыцьцё на аўтар Бацькаўшчыны. Пасьля агульнага ўшанаваньня памяці памёршых, старшыня ў далейшых словах сваей прамовы коратка намаляваў абраз сучаснага палажэньня Беларускага народу. Пасьля гэтага наступіла далейшае выкананьне праграмы сьвяткаваньня.

Рэфэраты.

Першы рэфэрат на тэму „Незалежнасьць Беларусі як ідэал — задаткам незалежнасьці фактычнай“ прачытаў студ. С. Сарока. Кароткі гэны рэфэрат, але багаты зьместам і стройны формай, гарманізаваў як сьлед з урачыстым настроем слухачоў.

Другі рэфэрат на тэму „Кастусь Каліноўскі, „Mužyckaja Praŭda“ і ідэя незалежнасьці Беларусі“ прачытаў кс. Ад. Станкевіч. Прэлегент, у блізка 2-гадзінным навукова апрацаваным рэфэраце, падрабязна прааналізаваў дзейнасьць Кастуся Каліноўскага і яго ідэю, якая кіравалася да самастойнасьці беларускага народу.

Рэфэрат гэны маем стэнаграфічна запісаны і надрукуем цалком. Друкаваць яго пачынаем у гэтым нумары.

Прывітаньні.

Пасьля заканчэньня рэфэрату пачаліся прывітаньні. Першы вітаў старшыня Украінскай Парлямэнтарнай Рэпрэзэнтацыі пасол др. Д. Левіцкі, які ў кароткіх словах, гаворачы паўкраінску, выказаў патрэбу беларуска-ўкраінскага супрацоўніцтва дзеля дабра Беларускага і Украінскага народаў. Другі вітаў прадстаўнік Тымчасовага Літоўскага Камітэту д р Альсэйка, які, прамаўляючы палітоўску, падчорківаў патрэбу супрацоўніцтва літоўска-беларускага дзеля зьдзейсьненьня народных ідэалаў Беларусаў і Літоўцаў. Ад віленскага жыдоўскага грамадзянства па жыдоўску вітаў д-р Выгодзкі, выражаючы пажаданьне, каб Беларускі народ хутка стаўся незалежным.

У гэтым мейсцы прадстаўнік адміністрацыйнай улады прарваў прывітальныя прамовы гасьцей, тлумачачы свой паступак тым, што не абазначаны прамовы прывітаньняў у парадку дня ўрачыстасьці, на якую выданы дазвол Гарадзкім Стараствам.

Пасьля гэтага неспадзяванага перарыву слоўных прывітаньняў, сябра Юбілейнага К-ту студ. Тумаш прачытаў пісьменныя і тэлеграфічныя прывітаньні ў наступным парадку:

1) ад Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў Празе В. Захаркі, 2) ад Саюзу Украінскіх Журналістаў ім. Ів. Франка ў Львове, 3) прывітальную тэлеграму ад нямецкіх паслоў польскага Сойму Граэбэ і Розумэка, 4) ад Беларускага Нацыянальнага Камітэту Заграніцай у Празе, падпісанае М. Вяршыніным, 5) ад Аб'еднаньня Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў (АБСА), 6) тэлеграму ад Нацыянальнага Камітэту Беларусаў Літвы, ад Беларускага Асьветнага Т-ва ў Літве і Аб'еднаньня Беларускага Студэнства ў Коўне, 7) ад Беларускага Навукова-Краязнаўчага Т-ва ў Латвіі, падпісанае старшынёй К. Езавітавым, 8) ад Т-ва Беларускай Моладзі ў Латвіі, 9) ад Беларускага Заграічнага Архіву ў Празе, 10) ад Саюзу Беларускіх Студэнтаў у Нямеччыне, 11) ад кс. Фр. Чарняўскага ў Францыі, 12) ад кс. праф. Я. Тарасэвіча ў Амэрыцы, 13) ад Беларускай Рады ў Празе, 14) ад Рэдакцыі „Беларуская Школа ў Латвіі“, 15) ад Д-р Бучынскай у Чэхаславаччыне, 16) ад Беларусаў Навагрудчыны, 17) ад беларускай інтэлігенцыі ў Навагрудчыне — Пражакоў Навагрудчыны, 18) ад гурткоў Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Віл.-Троцкім павеце — падпісанае Я. Ярмалковічам, 19) ад гуртка Бел. Інст. Гасп. і Культ. ў Харкох, Пастаўскага пав., 20) ад гуртка БІГіК ў Будславе, Вялейскага пав., 21) ад гуртка БІГіК ў Ляхавічах, Баранавіцкага пав., 22) ад гуртка БІГіК ў Ікazьні, Браслаўскага пав., 23) ад Управы Беларускага Дабрадзейнага Т ва ў Стоўпцах, 24) ад грам. грам. Пазьняка і Леўковіча ў Бэрэзе Картузскай, 25) ад сьвяшч. Ал. Каўша, 26) ад кс. В. Шутовіча, 27) ад кс. Ул. Талочкі, 28) ад Янкі Быліны, 29) ад Ал. Мілюця з Турца, Стаўпецкага пав. і 30) ад Ів. Шатраўскага з Сукневіч, Ашмянскага пав.

Падчас чытаньня прывітальных пісьмаў і тэлеграмаў тэлефонічна была паведамлена цэнтраля віленскай адміністрацыйнай улады аб перарыве прадстаўніком улады прывітальных прамоваў, з просьбай дазволіць закончыць вусныя прывітаньні госьцям, прыбыўшым на Акадэмію. Адміністрацыйныя ўлады на далейшае прывітаньне дазвол далі.

Першы пасьля перарыву вітаў прадстаўнік Украінскай Радыкальнай Партыі пасол Вахнюк, выражаючы пажаданьне Беларускаму народу зьдзейсьніць свой народны ідэал незалежнасьці. Пасьля выступіў дэлегат Украінскіх Пісьменьнікаў і Журналістаў імені Ів. Франка, рэдактар „Діла“ Кедрын, выказваючы значэньне прэсы для народу, а так-жа выражаючы пажаданьне росквіту прэсе беларускай, якая зьяўляецца вялікім дзейнікам ў імкненьні да незалежнасьці народу. Чарговы прамоўца д-р Выслоух, вітаючы ад Віленскага Польскага Клюбу „Włóczęgów“, заклікаў беларусаў да супрацоўніцтва з палякамі дзеля асягненьня ідэалу фэдэрацыі Беларусі і Польшчы, як вольных з вольнымі і роўных з роўнымі. У канцы віталі прадстаўнікі: «Украінскай Студэнскай Громады» Віленскага Унівэрсытэту — студ. Крахмалюк, Літоўскага Студэнскага Саюзу — студ. Краўжліс і Украінскай Студэнскай Корпарацыі „Круты“ — студэнт Фэдык.

Пасьля Акадэміі надышло прывітальнае пісьмо ад праф. Віленскага Унівэрсытэту Вітальда Станевіча.

Пасьля прывітаньняў старшыня Юбілейнага Камітэту Паўловіч у кароткай прамове дзякуе гасьцям і ўсей аўдыторыі за ўшанаваньне так важных юбілеяў у Беларускім народным адраджэньні і абвяшчае кароткі перарыў, заяўляючы, што пасьля перарыву адбудзецца канцэрт.

Канцэртны аддзел.

Пасьля 15 мінутнага перарыву выступае хор Беларускага Студэнскага Саюзу пад кіраўніцтвам грам. Шырмы і пачынаецца прыгожы канцэрт у парадку мілагучных, гарманійна-стройных пяцёх беларускіх песьняў. Мастацкае выкананьне хорам песьняў пад кіраўніцтвам умелай рукі рэгента, дапаўняе

ўрачысты настрой Акадэміі. У перарывах хору студ. Хворaст і студ. Г. Шутавічанка дэклямавалі беларускія вершы. Урачыстая Акадэмія канчаецца народным гымнам „Не пагаснуць зоркі ў небе...“, якога публіка слухала стоячы.

Па заканчэньні народнага гымну разлягласа па ўсёй залі і на хорах беларуская марсэльеза «Ад веку мы спалі“, напаўняючы гулкім сьпевам вагромную залю.

На гэтым урачыстая Акадэмія, якая пачалася а гадз. 8 веч., кончылася а гадзіне поўдванаццатай уночы.

ВОДГУКІ СЬВЯТКАВАНЬНЯ.

Сьвяткаваньне 15-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі і 70-тых угодкаў беларускае прэсы ў Вільні адбылося паважна і вельмі ўрачыста, зварачваючы на сябе ўвагу мяйсцовых палякоў, літоўцаў, а так-жа адбіваючыся рэхам і ў Львове, аб чым сьведчаць наступныя факты.

Аб беларускім народным сьвяце шырока апісвае літоўская газэта „Vilniaus Rytojus“ з дня 25.III с. г., пасьвячаючы вялікую стацьцю справе літоўска-беларускай. Памясьціў так-жа абшырную стацьцю „Przegląd Wileński“. Падалі справаздачу аб гэтай беларускай урачыстасьці даволі аб'ектыўна і віленскія польскія газэты: „Słowo“ і „Kurjer Wilenski“. Апісала беларускую народную ўрачыстасьць так-жа і ўкраінская львоўская газэта „Діло“.

Словам, гэнае сьвяткаваньне беларусамі сваіх народных юбілеяў дало ня толькі маральны пад'ём духа самым беларусам, але дало і пазытыўныя вынікі ў сэнсе шырэйшай прапаганды беларускай народнай справы.

СЬВЯТКАВАНЬНЕ 15-тых УГОДКАЎ АБВЕШЧАНЬНЯ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ БЕЛАРУСІ Ў БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАЙ САНАЦЫІ.

Шырокая і дружная падгатоўка незалежнага беларускага грамадзянства да сьвяткаваньня юбілеяў: 15-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі і 70-тых угодкаў беларускай прэсы не дало спакою і беларуска-польскай санацыі.

На агульна-беларускае сьвяткаваньне „санацыя“ не пашла, як гэта часткова зрабіла студэнская корпарацыя „Скорынія“, але наладзіла сьвяткаваньне 15 тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі асобна, «пасвоему», пасанацыйнаму.

Публічна сьвяткавала гэты юбілей „беларуская“ санацыя толькі ў Віленскай Пятніцкай праваслаўнай царкве, дзе ў дзень 25 сакавіка с. г. адбылася фактычна „urzędowa galówka“.

У царкве сьвяшч. Кульчыцкі адслужыў малебен; памаліўшыся за польскі ўрад, за Польшч і за польскае войска, сказаў так-жа і прамову, у якой наракаў на беларусаў, што ня прышлі на гэты малебен у царкву і пахваліўся, што беларусам у Польшчы добра, а што Беларускі народ ня мае сваей дзяржавы, дык да гэтага сам Бог не дапусьціў, бо беларусы дзеляцца на ор'ентацыі, замест ісьці з санацыяй.

СЬВЯТКАВАНЬНЕ НАРОДНАГА СЬВЯТА БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗЯЙ.

Беларуская вучнёўская моладзь беларускай філіі дзяржаўнай гімназіі ім. Ю. Славацкага ў Вільні сьвяткавала юбілей 15-тых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі цалком асобна — ў гімназіі. Саматугам наладзіла яна Акадэмію, якая складалася з рэфэрату і дэклямацыяў вершаў. На агульна-беларускую Акадэмію народнага сьвята дырэктар беларускай філіі вучням ісьці забараніў(!). А шкода! Думаем, што ўгодлівасьць начальству павінна мець свае граніцы.

* * *

Канчаючы, скажам агулам, што сьвяткаваньне беларускім незалежным грамадзянствам двух вялікіх беларусхіх юбілеяў адбылося сапраўды паважна і прыгожа. Сьвяткаваньне гэта паказала сапраўды, што беларуская адраджэнска самастойніцкая думка — ня гледзячы на „сваіх“ і чужых ворагаў — сярод беларускага грамадзянства жыве, разьвіваецца і ўсьцяж магутнее. Верыць трэба, што яна сапраўды пераможа.

п—к.

15-лецьце літоўскай зямельнай гаспадаркі.

Сёлета мінула 15 гадоў, як Незалежная Літва пачала будаваць сваю зямельную гаспадарку. Вось-жа з гэтай прычыны не адрэчы будзе з вынікамі гаспадаркі гэтай, хоць збольшага, зазнаёміцца і нам.

Літоўская газэта „Lietuvos Aidas“ (Nr.38) аб гэтай справе піша гэтак:

— Няведама, ці якая ў Эўропе дзяржава ў галіне рольнай гаспадаркі гэтакі зрабіла поступ, як Літва ў працягу 15-лецьця сваей незалежнасьці.

У першых гадох сваей незалежнасьці на агульны лік 3, 8 мільёнаў га аромай зямлі, Літва мела 1, 7 мільёна га зямлі сялянскай у шнюрох. Гэткі спосаб зямельнай гаспадаркі, як ведама, зьяўляецца ў нашым часе звычайным пэражыткам. У выніку праведзенай рэформы аж да апошняга часу ў Нез. Літве распарцэлявана 9,000 га грунтоў сялянскіх і больш 400,000 га зямлі дворнай, з чаго агулам утварылася больш як 100,000 новых самастойных гаспадарак. Бяручы пад увагу, што Літва агулам мае 300,000 гаспадарак, трэба прызнаць, што зямельная рэформа датыча там вялікага ліку гаспадарак.

Камасацыя вясковых грунтоў у Нез. Літве дала дужа памысныя вынікі. Нізкія і мокрыя землі ў некаторых мясцох былі звычайнымі балотнымі няўжыткамі, на якіх была немагчымай ніякая гаспадарка. Калі ня браць пад увагу стратэгічнага каналу між Вэнтай і Дубіссай, трэба сьцьвердзіць, што расейскія ўрады на працягу 120 гадоў свайго панаваньня, не правялі ў Літве ніякай зямельнай мэліорацыі. Незалежная-ж Літва, на працягу 15-цёх гадоў асушыла 240,000 га грунтоў, а так-жа нямала даканала мэліорацыі рознага іншага характару.

Дзякуючы захадам ураду, на працягу гэтага кароткага часу ў Нез. Літве так разьвілася малочная гаспадарка, што малочныя прадукты займаюць сусім паважнае месца ў літоўскім экспорце і даюць дзяржаве да 40 мільёнаў даходу ў год. Апрача гэтага дужа добра разьвіваецца ў Літве гадоўля ўсякай жывёлы, якая ў літоўскім гандлі займае адно з першых месц. У 1932 г. Літва, што да вывазу сьвіней у Англію, займала чацьвертае месца пасьля Даніі, Польшчы і Галяндыі.

Незалежная Літва, якая яшчэ нядаўна прывозіла цукар з заграніцы, сяньня мае ўжо ўласную цукроўню, якая пакрывае 3/4 усяго запатрэбаваньня.

Паважнае так-жа месца ў літоўскім гандлі займаюць: коні і лён.

Што датыча гаспадарчай асьветы, дык Нез. Літва ў гэтай галіне зрабіла таксама вялікі поступ. Прад вайной Літва мела адну вышэйшую і дзьве ніжэйшыя гаспадарчыя школы. А сяньня Літва мае Гаспадарчую Акадэмію, 4 вышэйшыя гаспадарчыя школы, 10 школ ніжэйшых, 16 народных гаспадарчых школ, 8 школ хатняй гаспадаркі і 298 гаспадарчых клясаў. Ува ўсіх гэтых школах агулам вучыцца 6 тысяч асоб.

Літоўскія гаспадары арганізавалі так-жа цэлы рад коопэратываў, якія ў гаспадарчым жыцьці Літвы маюць дужа вялікае значэньне. На агульны лік — 9, 9 мільёнаў кілёграмаў выэкспорвованага ў 1932 г. масла, 93% выэкспартавала Т-ва „Pienocentras“. Узноў-жа іншае коопэратыўнае літоўскае таварыства „Lietukis“ за 1931 г. мела абароту 36 міл. літ.—

З усяго вышэйсказанага бачым, што знача для народу мець сваю ўласную дзяржаву і жыць сваім самастоўным жыцьцём!

М. К

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

Латыска-беларускі слоўнік. Ад пачатку 1930 г. над зьбіраньнем матэрыялу да латыска-беларускага слоўніка працуе грам. П. Массальскі. Праца хутка будзе скончана і здадзена ў друк. — Шмат таксама матэрыялу сабрана ўжо і да другой часткі слоўніка — беларуска-латыскага.

125-тыя ўгодкі нарадзінаў В. Д.-Марцінкевіча (1807—1932) сьвяткавала беларускае грамадзянства м. Рыгі дня 22.I.33 г. На сьвяткаваньне зложыўся рэфэрат грам. М. Дзямідава і канцэртны аддзел. — „Беларуская Школа ў Латвіі“ № 1 (18), скуль бярэм усе гэтыя весткі, гаворачы аб угодках В Д.-Марцінкевіча, чамусьці скрозь называе іх угодкамі „сьмерці“ а не „нарадзінаў; тымчасам, наколькі ведама, В. Д.-Марцінкевіч радзіўся ў 1807 г., а памёр у 1884 г.

Kastuś Kalinoŭski, „Mužyckaja Praŭda“ i ideja Niezaležnaści Biełarusi.

(*Referat Ks. Ad. Stankiewiča, pračytany na ŭračystaj akademii 25.III.1933 h., z pryčyny 15-ych uhodkaŭ abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi i 70-ych uhodkaŭ biełaruskaj presy. Drukujem pawodle stenahramy*).

„Bywaj zdarowy, mužycki narodzie,
Žywi ŭ ščaści, žywi ŭ swabodzie,
I časam spamiani pra Jaśku twajho,
Što žhinaŭ za praŭdu dla dabra twajho!

A kali słowa piarojdzie ŭ dzieła,
Tady za praŭdu stanawisia śmieła,
Bo adno praŭdaj, u hramadzie zhodna,
Daždžeš, Narodzie, staraści swabodna...

A kali mianie ŭspomniš, ščyra pamalisia,
To ja z taho świetu tabie adazwusia“.

(*Z piśmaŭ K. Kalinoŭskaha da biełaruskaha narodu „Z pad šybienicy“*).

I. Ideowaja łučnaść miž aktam 25.III.18 h. i pracaj K. Kalinoŭskaha 1862—1864 h.

Sławami, jakija źmieščany na pačatku hetaj pracy, słaŭny narodny baraćbit naš Kastuś Kalinoŭski raźwitwaŭsia z biełaruskim narodam u wadnym z pradśmiertnych swaich listoŭ, pisanych u wastrozie niezadoŭha prad swajej śmierciaj. (*Giller — Historja powstania 1863 r. t. I, 176 i nast. u dapisku*). U piśmie hetym, jak bačym, Kalinoŭski žadaje, kab biełaruski narod, za jaki chutka mieŭ jon złažyć žyćcio swajo, pomniŭ ab im, za što z swajho boku pryrakaje tak-ža ab hetym narodzie pomnić i nawat adhuknucca z taho świetu.

Pradśmiertnuju wolu wialikaha baraćbita našaha, światkujučy ŭračysta hety jubilej, spaŭniajem jak naležycca. Siańnia światkujem 15 yja ŭhodki abwieščańnia niezaležnaści Biełarusi, a razam z hetym i 70 yja ŭhodki pieršaj biełaruskaj časopisi „Mužyckaja Praŭda“, redaktaram i wydaŭcom jakoj byŭ Kastuś Kalinoŭski (*Карскiй — Бѣлоруссы III, 3, 83—86, Giejsztor — Pamiętniki I 370—371*). Łučačy hetyja dwa jubilei ŭ wadzin i razam ich siańnia światkujučy, ni adnaho z ich nie pamianšajem, a naadwarot — pawialičwajem, bo dapaŭniajem. Toje ŭsio, čaho swajej pracaj ahułam, a pradusim „Mužyckaj Praŭdaj“, a tak-ža i śmierciaj swajej dakanaŭ K. Kalinoŭski dla biełaruskaha narodu siemdziesiat hadoŭ tamu, zmahajučysia za wolu i dolu hetaha narodu, — akt abwieščańnia niezaležnaści Biełarusi 25.III.18 padabraŭ, zharnuŭ u całaść, prykrasiŭ, dapoŭniŭ i wyraziŭ jak jaŭnuju — užo sučasnuju — wolu, biełaruskaha narodu da wolnaha i samastojnaha žyćcia. Słowam, ziarnio, jakoje na biełaruskaj hramadzka-palityčnaj niwie pasiejaŭ Kalinoŭski, akt 25.III.18 zžaŭ, karystajučysia pładom henaha ziarniaci dla siaŭby dalejšaj. Jak bačym, sapraŭdy miž piatnaccatymi ŭhodkami abwieščańnia Biełarusi niezaležnaj i miž 70 uhodkami „Mužyckaj Praŭdy“ isnuje ideowaja łučnaść.

II. Miesca K. Kalinoŭskaha ŭ nawucy.

„Kali ty mianie ŭspomniš — kaža Kalinoŭski da biełaruskaha narodu — ja da ciabie z taho świetu adazwusia“. Woś-ža narod biełaruski ab wialikim baraćbicie swaim sapraŭdy ŭspomniŭ i sapraŭdy da jaho adazwaŭsia. Stałasia heta adnak paśla całaha radu dziesiatkaŭ hadoŭ paśla mučanickaj śmierci jaho. U 1864 hodzie Kalinoŭski pawis na šybienicy, a narod, za jaki jon złažyŭ siabie ŭ achwiary na aŭtary Praŭdy, dalej hibieŭ u niawoli kulturnaj, ekanamična-socyjalnaj i palityčnaj. Niawolu hetu nad biełaruskim narodam trymali krepka susiedzi našy z zachadu i ŭschodu. Na narod naš hladzieli jany wykłučna tolki praz akulary swajho narodnaha samalubstwa. Usio toje, što narod naš mieŭ, susiedzi hetyja, wypiaradžajučy adny adnych, abo swaim ličyli, abo zacirali, zaciamniali i puskali ŭ niapamiać. Išło im ab toje, kab dakazać, što biełaruski narod — heta „iskoni ruskij narod“, abo što heta „od wieków polski lud“. Takim čynam, biełaruski narod dla palakoŭ i dla rasiejcaŭ u historyi staŭsia rečaj, staŭsia karysnym materjałam dziela polskaj i rasiejskaj kulturaŭ. U hetkich warunkach pakazać

Сьмерць а. Ул. Піонткевіча.

24-га сакавіка с. г. у Альбэртынскім манастыры каля Слоніма памёр настаяцель усходняй місіі а. а Іезуітаў, а. протоігумен Уладзімер Піонткевіч.

Асоба нябожчыка ведама нашым чытачом і шырэйшаму мясцоваму грамадзянству з таго, што ён з некалькімі аднадумцамі ў 19 5 г. быў закладчыкам усходняй місіі а.а. Іезуітаў на беларускіх землях (Альбэртын каля Слоніма) і ідэолёгам каталіцтва паводле ўсходне славянскага абраду наагул. Гэтай ідэі нябожчык быў верны да самай магілы, за што меў нязьлічаныя прыкрасьці з боку „власть имущих“. Трэба пры гэтым адзначыць, што беларускія нацыянальныя патрэбы, пры місіянарскай працы нябожчыка а. П. як і цэлай Усходняй місіі а.а. Іезуітаў, былі браны пад увагу. Досыць успомніць, што місія гэта другі год ужо выдае беларускі рэлігійны месячнік „Да Злучэньня!“, а беларуская мова ў унутраным жыцьці місіі на беларускіх землях займае пачэснае месца.

Паховіны а. Протоігумена Піонткевіча адбыліся 27 г. м. Сярод многіх прамоваў над гробам была прамова і беларуская, якую сказаў а. Неманцэвіч, рэдактар часопісі „Да Злучэньня!“

Незалежна ад таго, якія хто мае перакананьні аб спосабах працы над зблізкэньнем і злучэньнем праваслаўнай царквы з каталіцкай, — хто толькі прызнае патрэбу гэтага зблізкэньня, той прызнаць мусіць нябожчыку нязвычайныя заслугі, паложаныя ў гэтым-жа кірунку і ад душы сказаць: мір прахові Твоему!

—ч.

З Польшчы.

Закрыцьцё сэсіі Сойму і Сэнату. У сераду 29 м. м. Сойм і Сэнат закончыў бюджэтную сэсію. Прэзыдэнскім дэкрэтам бюджэтная і звычайная сэсія Сойму і Сэнату закрыты.

Выбары Прэзыдэнта. Кадэнцыя сучаснага Прэзыдэнта Польшчы ўжо канчаецца. Выбары новага прэзыдэнта маюць адбыцца ў м-цы траўні. Кандыдатаў на прэзыдэнта намячаюць: сучаснага прэзыдэнта праф. Масьціцкага, прэм'ера Прыстара, марш. Пілсудзкага і І. Падарэўскага.

Разьвязаньне „Obozu Wielkiej Polski“. На аснове распараджэньня міністэрства ўнутраных спраў, эндэцкая арганізацыя „Obóz Wielkiej Polski“ разьвязана на ўсім абшары сучаснай Польшчы.

З заграніцы.

Палітычнае заварушэньне ў Эўропе. Цяпер у Эўропе насьпяваюць падзеі, прад якімі ў некаторых выступае нэрвовы зімны пот.

Побач Лігі Народаў і „Разаружальнай“ Конфэрэнцыі, якія заўзята пераліваюць з пустога ў парожнае, паўсталі ў Эўропе два блёкі дзяржаў. Першы блёк, пад камандай Францыі, Польшчы і дзяржаў Малой Антанты (Румынія, Чэхаславаччына і Югаславія). Другі блёк — Італія, Нямеччына, Мадзяршчына і Баўгарыя. Першы блёк заўзята бароніць „сьвятасьць“ Вэрсальскага трактату, а другі блёк з такой-жа заўзятасьцяй дамагаецца рэвізіі Вэрсальскага трактату, называючы яго „насільным дыктатам“ над пераможанымі.

Пакуль Нямеччына ўнутры была слабай, францускі блёк не баяўся Італіі і яе палітыкі тварэньня саюзу дзяржаў дзеля дамаганьня рэвізіі „сьвятасьці“ Вэрсальскага дагавору. Нямеччына аднак акрэпла і італьянска-нямецка-мадзярска-баўгарскі блёк стаўся сільнейшым ад францускага. Убачыла гэта сяньня і Францыя. Апошнімі часамі ўсё часьцей і часьцей можна было чуць у Францыі галасы, якія дамагаліся зьмены францускай заграічнай палітыкі. Найбольш дамагаліся радыкалы, якія далі Францыі цяперашні ўрад. Гэту зьмену настрояў у першую чаргу адчула Польшч, якой французы адмовілі далейшай пазычкі і ўсё мацней загаварылі аб патрэбе зблізкэньня Францыі з Нямеччынай.

Англія на ўсё гэта глядзела з-боку. Бачачы аднак, што ўсе ўваружаюцца і яна рабіла тое самае; але гэта дарага каштуе. Англіі патрэбны супакой у Эўропе, каб добра гандляваць і мець пэўнасьць на свае грошы, якія знаходзяцца ў прадпрыемствах і гандлю па ўсёй Эўропе. Дзеля гэтага так моцна стараўся англійскі прэм'ер Макдональд, каб давясьці да позытыўнага рэзультату конфэрэнцыю разбраеньня ў Жэнэве. І аднак не ўдалося.

Англія і Францыя праканаліся, што з гутаркаў аб разбраеньні нічога ня будзе датуль, пакуль ня будуць загашаны два найгразьнейшыя вогнішчы спору ў Эўропе — польска-нямецкая граніца і італьянска-францускі спор за Серадземнае мора і ўплывы ў паўночнай Афрыцы.

Францыя, у якой ніхто нават і ня думае біцца ня толькі за Польшч, але нават і за паўноч. Афрыку, хацела-б пагадзіцца з Італіяй і жыць у згодзе з Нямеччынай. Дзеля гэтага яна рашылася зьмяніць заграічную палітыку. Але што рабіць з Польшчай? — Францыя з ёй у Саюзе.

Над гэтай справай дня 10 м. м нараджаліся ў Парыжы: ангельскі прэм'ер Макдональд з сваім міністрам заграічных спраў Саймонам, з францускім прэм'ерам Дэлядіе і францускім міністрам заграічных спраў Поль Бонкурам. Пасьля гэтага Макдональд, Саймон і Бонкур выехалі 11 м. м. у Жэнэву і там праз пяць дзён вялі перагаворы з рознымі васаламі Францыі. З Варшавы спэцыяльна выклікалі яны польскага міністра заграічных спраў Бэка і нагаварвалі яго да ўступкі для Нямеччыны ў справе калідору. Ня ведама, што на гэта сказаў міністр Бэк, але ад уступкі мусіць адказаўся. Вельмі цяжка пайшла справа і з іншымі прадстаўнікамі дзяржаў францускага блёку. Тады Макдональд на помач выклікаў з Парыжу прэм'ера Дэлядіе.

Усе гэныя захады ні да чога не давялі. У адказ на гэта, паявілася новая „бомба“: Макдональд і Саймон выехалі 17 м. м. ў Рым, каб перагаварыцца з дыктатарам Італіі Мусолінім. Спатканьне было ветлівае, але Мусоліні заявіў, што зусім згаджаецца з Нямеччынай у справе канешнасьці рэвізіі Вэрсальскага трактату і падаў новы плян новага ўкладу сіл ў Эўропе, які выглядае гэтак:

Францыя, пагадзіўшыся з Італіяй, уступае ў блёк з Італіяй, Нямеччынай і Англіяй. Гэныя чатыры дзяржавы пасьля правядуць канешныя зьмены Вэрсальскага дагавору ў рамах Лігі Народаў. Іншага выхаду Італія ня бачыць.

Гэтак кончылася палітычная нарада ў Рыме. У Эўропе яна адгукнулася вялікім рэхам, як удар грому. Бэрлін здаволены, Варшава нэрвуецца. Польская прэса піша, што Макдональд увяз у сетку настаўленую Муссолінім і Гітлерам.

Словам, падзеі ў Эўропе насьпяваюць.

Hutarka dziadźki Ściapana.

Było ŭspomniena ŭ papiarednia j hutarcy ab wiaskowych dziaŭčatach. Ciapier pahaworym ab chłopcach.

Pieršym z błahich nałohaŭ našych malcaŭ jość častyja bojki, katoryja pierawažna paŭstajuć z pjanstwa. Časta, naprykład, zdarajecca ŭ našaj wakolicy, što na wiečarynach (bywała ŭ miasajed ie) pabjucca „palaki“ z „litoŭcami“. — Jakijaž heta „palaki“ a jakija „litoŭcy“? Ci „palaki henyja pryjechali z Waršawy ci z Krakawa? — Nie. — Heta tyja samyja sialanie našych biełaruskich wiosak. A „litoŭcy“? Hetaž taksama našyja susiedzi — sialanie hetaj, abo susiedniaj wioski. Usie jany pawinny być bratami i nia bicca, a naadwarot — pawinny kachać adzin druhoha, a ŭ patrebie — niašci najchutčej pomač. Čamu ž hetaha niama ŭ našaj moładzi? Čamuž wy „palaki“ nia lubicie hutarki swaich susiedziaŭ litoŭcaŭ? Jany ž taksama ludzi, jak i Wy. Jany-ž pawinny być našymi sajuźnikami, a my ichnymi pryjacielami. Jany jość i buduć litoŭcami, a Wy, darahija bratočki, nia dumajcie, što wy i sapraŭdy palaki, jak sami siabie ličycie. Was naradziła biełaruskaja wioska, ziamla biełaruskaja was uzhadawała, a wy ciapier uzrosšy pačuli ad niejkich uradoŭcaŭ, što wy „palaki“ i hetak ciapier zawieciesia. Padumajcie tolki, darahija Braty, i prypomnicie, što ŭsie my tut Biełarusy i pawinny trymacca swajej biełaruskaści, a nie wyrakacca jaje i nie rabić z siabie „palakaŭ“. — Mnie staromu, zdajecca, što hetkaja „baraćba“ wašaja nie dawiadzie da ničoha dobraha. Skarystajuć z hetaha tolki našy worahi.

Kab da hetaha nie dapuścić, nie naleža tak rabić, jak my rabili dahetul. My pawinny łučycca ŭsie ŭ adnu rodnuju—biełaruskaju arhanizacyju i ŭ jej pracawać dla ahulnaha i swajho ŭłasnaha dabra. *Dziadźka Ściapan.*

praŭdziwy swoj twar, zahawaryć ab sabie swajej mowaj, baranić swaju indywidualnaść było nia lohka. Bo kali narod hety i prahawarywaŭ ab sabie słowa praŭdy, kali wystupaŭ u wabaronu siabie praz słaŭnych synoŭ swaich, jak Kalinoŭski, to tyja-ž susiedzi hołas hety hłušyli abo, nawat, raschodziačysia z praŭdaj, pradstaŭlali jaho ŭ swaim, karysnym sabie światle. Woś-ža ŭ historyi polskaj i rasiejskaj Kalinoŭski pradstaŭleny zwyčajna abo jak „samolubiwyj biezumnyj miatiežnik“, abo jak „polski bohater narodowy o krańcowych nieco poglądach“. Adnak polskija i rasiejskija historyki i paswojmu malujučy Kalinoŭskaha, časta mimawolna, abo nie prydajučy značeńnia peŭnym faktam, ab im mnoha haworać čyściusieńkaj praŭdy.

Woś-ža naležna praanalizawać usie tyja dakumenty, jakija adnosiacca da asoby Kalinoŭskaha, a tak-ža wybrać z uspaminaŭ ab im i apracawańniaŭ adpawiednyja fakty i naležnaje dać im aświatleńnie, naleža pradusim da historykaŭ biełaruskich, a tak-ža i litoŭskich, bo Kalinoŭski ziemli hetych narodaŭ razważaŭ jak adno całaje. Tak jano i stałasia. Pieršym pakazaŭ nam praŭdziwy twar Kalinoŭskaha litoŭski prafesar A. Janułajtis (*„1863 metu sukilimo veikejai Lietuvoje. I Kastantinas Kalinauskas“* u *„Švietimo Darbas“ Nr. 1—2 1921“*). Heta jon źwiarnuŭ uwahu na toje, što miž paŭstancami 1863 h., jakich zwyčajna zaličali da palakoŭ, byli sapraŭdnyja narodnyja heroi litoŭskija (ks. Ant. Mackiewič), a tak-ža i biełaruskija, jak Kalinoŭski, jakija išli na paŭstańnie prociŭ cara, prociŭ panščyny, śnili sny ab woli i doli narodu litoŭskaha i biełaruskaha i zmahalisia za swajho rodu palityčnuju samastojnaść hetych narodaŭ, za samastojnaść swajho kraju.

Prysoŭ urešcie tak-ža čas, kali jak-by spaŭniajučy pradśmiertnuju wolu Kalinoŭskaha, uspomniła ab im i biełaruskaja nawuka. Biełaruskija wučonyja, jak praf. Ihnatoŭski (*Гісторыя Беларусі ў 19 і ў пач 20 ст. 123—127 і 138—142*), z niapamiaci, z šmatletnich pleśniaŭ na światło dziennaje pačali wydabywać słaŭnuju asobu našaha narodnaha heroja Kalinoŭskaha. Dziakujučy biełaruskaj nawucy asoba jaho stała popularyzawacca, wiestki ab im stali pranikać u narodnyja hušči, asabliwa-ž u dušy biełaruskaj moładzi. U Miensku, ŭ biełaruskaj sceničnaj literatury pajawiłasia nawat drama: „Kastuś Kalinoŭski“, jakaja niekalki hadoŭ tamu była ŭlublonaj pjesaj Mienskaha biełaruskaha teatru. Słowam, pamiać ab słaŭnym Kalinoŭskim sapraŭdy adžyła ŭ nas. Zacikaŭleńnie im paŭstała značnaje, asabliwa ŭ hetych hadoch, kali wypali 70 uhodki „Mužyckaj Praŭdy“ i kali ŭ budučym hodzie prypadajuć tak-ža 70 uhodki kaźni jahonaj. Siańnia ŭ Biełarnsaŭ ab Kalinoŭskim, kali jašče nie stwaryłasia całkom, dyk tworycca — nawat i ŭ nawucy — lehienda jak ab baraćbicie za niezaležnaść Biełarusi i prytym u sučasnym razumieńni

Tak, šmat u hetym praŭdy, ale da praŭdy zakradajecca krycha i niapraŭdy, kali my modernizujem historyju i swaich sapraŭdnych narodnych herojaŭ z prad 70 hadoŭ zmušajem hawaryć ciapierašnim našym biełaruskim palityčnym jazykom i prypiswajem im našyja sučasnyja ideały. Dyk, jak bačym, sapraŭdnaje miesca Kalinoŭskaha ŭ nawucy naležna nie abaznačana dahetul nia tolki ŭ palakoŭ i rasiejcaŭ, što jość całkom naturalnym, ale tak-ža i ŭ nas biełarusaŭ. Dakanać hetaha pawinna nawuka biełaruskaja.

Tak, Kalinoŭski — heta sapraŭdy biełaruski samastojnik, ale swajho času i maładoj biełaruskaj nawucy naleža spakojna i wytrywała raźjaśnić sutnaść hetaj jaho samastojnickaj idei, jaje hranicy, terytoryju, na jakoj ideały swaje žadaŭ ździejśnić i ŭrešcie warunki, u jakich jon žyŭ i pracawaŭ, bo za siemdziesiat hadoŭ, jakija addzialajuć nas ad taho času, kali žyŭ Kalinoŭski, u žyćci našaha narodu, a tak-ža i ŭ našym paniaćci, šmat što źmianiłasia.

Woś-ža, majučy heta ŭsio na pamiaci, naskolki pazwalajuć mnie ciesnyja ramki hetaha referatu i ŭračystaść siańniašniaha dnia, składaju ja ab Kalinoŭskim i jahonaj pracy swaje ŭwahi. I kali-b heta skromnaja praca maja ŭ biełaruskaj — dy j niebiełaruskaj — nawucy wyklikała bolšaje zacikaŭleńnie henaj słaŭnaj asobaj, pahłyblajučy ab jej wiedu i kali-b uzbudziła ŭdziačnaść dla jaje ŭ našym narodzie, ja ŭważa-by, što dapiaŭ swajej mety.

(d. b.)

Nr.6. STUDENSKAJA TRYBUNA 2.IV.1933.

Z tempam žyćcia!..

Ciapierašnija abstaviny biełaruskaha narodu žjaŭlajucca niazvyčajna skomplikavanymi. Narod naš cierpić niabyvały ekanamičny kryzys i nacyjanalnaje pryhniečańnie. U vialikaj miery žjaŭlajecca jon pradmietam biaźlitasnych eksperymentaŭ, jakija raniać jahonuju dušu. Ciažkoje žyćcio i stvoranyja specyjalna abstaviny nanosiać z kožnym dniom tak mnoha moralnych i fizyčnych udaraŭ našamu narodu, što niščać usie jaho duchovyja siły. Hety fakt žjaŭlajecca zusim niepieraŭvialičanym i ŭ svaich rezultatach moža być vielmi hroznym. Heta pavinna horača pryniać da serca našaja maładaja intelihiencyja, studenstva. Jano ŭ pieršy čarod pavinna być čułym na ŭsie nienarmalnyja prajavy ŭ našym narodzie i jak maha prociŭstavicca im. Kab choć u najmienšaj miery dakanać heta, treba być najbolš aktyŭnymi, dakładna vyčuć puls žyćcia i ŭ zaležnaści ad hetaha viaści svaju hramadzkuju pracu, ci inakš kažučy — treba iści razam z žyćciom.

Hetaja pastanoŭka zdajecca zusim pravilnaj i nie patrabuje specyjalnych vyjašnieńniaŭ. Tymčasam siarod našaha studenstva žjaŭlajecca jana najbolš zaniadbanaj. Pryhladajučysia bližej da žyćcia i pracy našaje studenskaje moładzi, prychodzicca z sumam ščvierdzić, što hetaja moładź u vialikaj miery adyjšła ad žyćcia, žjaŭlajecca hłuchoj na aktualnyja pryzyvy dnia. Pryčyna hetaha ŭ značnaj miery kryjecca ŭ tym, što našaja moładź, jak i intelihiencyja naahuł, nia ŭmieje ŭ svajej hramadzkaj pracy pahadzić teoryi z praktykaj. Našaje studenstva ŭ značnym svaim liku pryvykła zahladacca na biełaruskuju spravu z čysta teoretyčnaha punktu hledžańnia roznych hramadzkich kirunkaŭ, poŭnaściu izolujučysia ad tych specyjalna vytvaranych i niazvyčajna skomplikavanych abstavinaŭ, u jakich apynuŭsia naš narod. Mnoha dyskutujecca na temy socyjalizmu i nacyjanalizmu. Staronniki socyjalistyčnaha śvietapahladu, trymajučysia ścisła teoryi, starajucca zusim vyklučyć z kruhu svaich zaintaresavańniaŭ spravu nacyjanalnaha adradžeńnia biełaruskaha narodu. I naadvarot — staronniki biełaruskaha nacyjanalizmu nie dacenivajuć pytańniaŭ socyjalnych. Taki stan rečaŭ žjaŭlajecca poŭnaściu nienarmalnym i vyrazna piarečyć zapraŭdnym intaresam biełaruskaha narodu. Treba viedać, što biełaruski narod žjaŭlajecca ŭ specyjalnych abstavinach, vytvaranych jaho historyjaj, jak i sučasnym pałažeńniem, i stasavać da jaho tyja ci inšyja hramadzkija kirunki, jakija vyraśli na čužym, inšym nam hruncie, jošć pamyłkovym. Taki stan rečaŭ žjadaje ŭsie žyćciovyja siły maładoj heneracyi i viadzie jaje da miortvych doktrynaŭ, čužych našamu narodu. Pakolki našaja moładź budzie zamykacca ŭ sfery čužoj nam teoryi, patolki jana budzie addalacca ad žyćcia, nia budzie zdolnaja zrazumieć jaho burlivaha tempa. Z hetaha začarovanaha koła treba znajści vychad. Vychad hety na naš pahlad jasny.

Zamiest adarvanych ad žyćcia, „metafizyčnych" razvažańniaŭ ab tym, z jakimi pryzyvami iści ŭ narod, treba pieradusim naahuł iści ŭ hety narod i svaju hramadzkuju pracu ścisła prystasavać da aktualnych vymohaŭ žyćcia biełaruskaha narodu. Treba ad niaŭdałaj teoryi pierajści da praktyki, konsekventnaj i zdecydavanaj. Kali my pojdziem razam z žyćciom, to spravy socyjalizmu i nacyjanalizmu, jakija tak mnoha zavaračyvajuć hałovy našym maładzionam, pierastanuć być aktualnymi prynamsi ŭ tej formie, jak heta jošć ciapier. Jaki hramadzki kirunak pałažyć u asnovu našaje pracy—pakaža samo žyćcio dy najbolš istotnyja patreby i zadańni biełaruskaha narodu. Žudasnaje pałažeńnie, halita biełaruskaha narodu, tanny zbyt jaho praduktaŭ, ciažkija ŭmovy pracy, vialiki hoład ziamli pry nadmiernym jaje liku ŭ abšanikaŭ i inš. — usio heta musić lehčy ŭ asnovu našaha socyjalnaha śvietapahladu. Ale aprača hetaha narod naš nia mienš cierpić i nacyjanalnaje pryhniečańnie. Stvoranaje pałažeńnie niasie jamu nacyjanalnuju zhubu. Voś-ža heta apošnije pavinna ŭ nas vyrabić vialikuju nacyjanalnuju adpornaść. Na nacyjanalny šovinizm čužnikoŭ u adnosinach da našaha narodu my pavinny adkazać ćviordaj nacyjanalnaj stojkaściu.

Takim čynam biełaruskaje žyćcio vymahaje suładnaj harmonii miž abodvymi aktualnymi siańnia i adnačasna praciŭnymi miž saboj kirunkami: socyjalizmam i nacyjanalizmam. Hetaja harmonija była ideolohičnym padkładam na praciahu ŭsiaho biełaruskaha adradžeńnia pačynajučy ad Bahuševiča, jošć jana žyćciovaj i siańnia. Stanoviačysia na takuju ideolohičnyju platformu, my nie raźminiomsia z istotnymi intaresami biełaruskaha narodu. Naadvarot, izolujučysia ad suchich teoretyčnych doktrynaŭ, my prystasujem svaju pracu da specyjalna vytvaranych umovaŭ, u jakich siańnia znachodzicca biełaruski narod, inšymi słavami havoračy—my budziem iści razam z tempam žyćcia. *St.*

Dzień 25.III.1933.

Dla nas dzień hety — viaśniajaje śviata.
Dla nas dzień hety nia tolki abvieščańnie śvietu praroka.
Dla nas dzień hety — śviata viasny, śviata naradžeńnia novaj epochi.
Symbol prabudžeńnia i śviata najbolšaha, najdaskanalšaha čynu Pahoni.
Dla nas dzień hety, dzień uspaminu tych, što zahinuli ŭ bai i pakinuli nam śviaty abaviazak pradaŭžać ich pracu, zakončyć raspačatuju budovu.
Bo-ž dziaržavu nia ŭ sile stvaryć adnamu pakaleńniu i tamu hod 1918 stvaryŭ tolki fundament.
I fundamentu hetaha, palitaha kryvioju barcoŭ, nie zrujnavała varožaja siła... Nie.
Hety fundament raście, macnieje ŭ nabałełych dušach, tuhoju raba za volaju... I Śviata Dvaccać Piataha Sakavika niachaj budzie pierakazčykam fundamentu hetaha z hodu ŭ hod, z rodu ŭ rod...
Niachaj budzie tradycyjaj napaminańnie: „Biełaruś niedabudavana! Zaviet barcoŭ 1918 h. nia vykanany".
Na šyrokich prastorach Słuččyny sumujuć straleckija mahiły...
Tam vorah akidaje ich hłumam i kpinami.
Tam vyryvaje kryžy z mahił i beścić ich.
Tam cieni paŭšych barcoŭ sumujuć i kličuć nas:
Končcie spravu, jakuju raspačali my 25.III.1918 h.
. . . .
Pieršy raz u pryrodzie zyjšła viasna z viasnoju...
Viasnoju 1918 h. mieŭ viasnu ŭ sim nutry svaim Biełaruski Narod.
Zabyŭsia pra niadaŭni son-zimu, śviatkujučy śviata pieramohi...
Śmierćciu śmierć papraŭ... Žyćcio pieramahło śmierć...
Sakavikovaje śviata niachaj budzie našym nacyjanalnym Vialikadniam...
Bo vialiki byŭ 25 sakavik 1918 hodu...
Bo ŭ toj dzień uvaskros Narod...
Bo ŭ toj dzień uvaskrosła Nacyja...

Berlin, Sakavik 1933 h.

A. Škutka.

Pravakacyjny danos.

Orhan biełaruska-polskaj sanacyi „Родны Край", u numary 7 z dnia 25.III. h. h. robić vyrazny pravakacyjny danos na biełaruskich studentaŭ u Berlinie. Hetaja hazecina ŭ zaciemcy „Sensacyjnyja viestki", havoračy ab prajekcie niamieckaha kanclera Hitlera stvareńnia Ukrainska-Biełaruska-Litoŭskaj dziaržavy, piša: „Z inšych krynicaŭ iduć viestki ab tym, byccam Hitler navat pryniaŭ asabista pradstaŭnikoŭ biełaruskaha studenstva ŭ Berlinie, z jakimi vioŭ hutarku ŭ spravie „padtrymańnia biełaruskaha niezaležnickaha ruchu". Voś-ža padavańnie takich „viestak", niezaležna ad taho, ci jany praŭdzivyja, ci nie, jošć jaŭnym pravakacyjnym danosam na našych studentaŭ, što vučacca ŭ Berlinie. Hetym krokam pany Łuckievič i Astroŭski vypieradzili navat Paŭlukieviča, jaki pamima vyrazna defenzyŭnaha stanovišča pierad biełaruskim hramadzianstvam, na takoha rodu danosy, pry hetym vyssanyja z palca, nia moh zdabycca. Vidać, z biełaruskaj sanacyjaj pierastali ŭžo zusim ličycca, dziela čaho roznymi insynuacyjami choča jana prypomnić svaim chlebadaŭcam, što moža jašče być im patrebnaj. My nia majem ničoha prociŭ, što biełaruskaja sanacyja za hrošy pradaje svaju ŭłasnuju hodnaść i sumleńnie. Ale vostra protestujem suproć pravakavańnia jej, dziela ŭłasnaje karyści, biełaruskich studentaŭ, jakija z nadludzkimi vysiłkami zmahajucca z hoładam i chaładam, dziela atrymańnia vyžšaje aśviety. *M. M.*

Etnohrafičny Kancert.

Tavarystva Pryjacielaŭ Biełarusaviedy dn. 18 sakavika s. h. ŭ zali Śiadeckich Universytetu ładziła etnohrafičny kancert. Na prahramu kancertu złažyłasia lekcyja hram. R. Šyrmy na temu: „Biełaruskaja narodnaja pieśnia" i Chor pry B.S.S. pad kiraŭnictvam taho ž hr. prapiajaŭ najbolš charakterystyčnyja cykli biełaruskich narodnych pieśniaŭ. Kancert prajšoŭ vielmi ŭdała i vyklikaŭ hłybokaje ŭražańnie siarod vialikaha liku prysutnych. Niazvyčajna vialikaje zachopleńnie vyklikali siarod prysutnych pieśni kupalskija, žniŭnyja, vałačobnyja, viasielnyja dy niekatoryja bytavyja. Asablivaja ŭvaha arhanizataraŭ kancertu była źviernuta na toje, kab pakazać najbolš charakterystyčnyja rysy biełaruskich narodnych pieśniaŭ, paznajomić z jaje sumnaj i bahataj melodyjaj. Hetaja meta arhanizataraŭ była poŭnaściu asiahnutaj. Kožny prysutny pierażyvaŭ takoje ŭražańnie, jakby ŭzapraŭdy znajchodziŭsia ŭ biełaruskaj raśśpiavanaj vioscy. Vialiki arhanizatarski talent hram. Šyrmy, dobra pryhatovany na chor dy vielmi adpaviedny padbor repertuaru, pastavili kancert na adpaviednaj mastackaj vyšyni. Astajecca tolki vykazać pažadańnie, kab takija imprezy adbyvalisia čaściej; jany majuć vialikaje značeńnie ŭ kulturnym žyćci biełaruskaj Vilni.

Prysutny.

Chronika.

Litaraturny viečar biełaruskich paetaŭ Zachodniaje Biełarusi. Tavarystva Pryjacielaŭ Biełarusaviedy pry U.S.B. ŭ Vilni dnia 7 maja s. h. ładzić literaturny viečar, na jakim buduć čytacca tvory biełaruskich paetaŭ Zachodniaje Biełarusi. Značny lik paetaŭ pradeklamuje svaje tvory asabista; tvory tych paetaŭ, jakija nia buduć mahčy na aznačany čas pryjechać u Vilniu, buduć adčytany na viečary specyjalnymi deklamatarami.

Chor pry B.S.S. Isnujučy druhi ŭžo hod Chor pry B.S.S pad kiraŭnictvam hr. R. Šyrmy, jaki swaim dabranym składam i ŭmiełym kiraŭnictvam, staŭsia šyraka viedamym u Vilni, prajektuje pa vialikodnych śviatach sarhanizavać niekalki kancertaŭ u inšych miestach Biełarusi. Chor maje na mecie ŭ pieršuju čarhu adviedać Biełastok, Horadniu, Vaŭkavysk i susiednija miesty. Hetuju dumku astajecca tolki pryvitać i pažadać joj najšyrejšaha zrealizavańnia.

Lekcyja ŭ BSS. Dnia 12 sakavika s.h. Ks. V. Hadleŭski pračytaŭ u BSS. lekcyju na temu: „Značeńnie chryścijanstva ŭ hramadzkim žyćci". Lekcyja vyklikała hłybokaje zacikaŭleńnie siarod biełaruskaha studenstva. Paśla lekcyi adbyłasia doŭhaja i rečovaja dyskusija.

Studenskaja Revija. Hrupa studentaŭ siabraŭ BSS. pastanaviła pa vialikodnych śviatach sarhanizavać reviju z aktualnym źmiestam z žyćcia biełaruskaha studenstva i starejšaha hramadzianstva. Užo pracuje ad hoc paklikany Kamitet, jaki ŭziaŭsia za arhanizacyju samoj imprezy, jak i padhataŭleńnie repartuaru.

Adkazy Redakcyi:

Sajuzu Biełaruskich Studentaŭ u Berlinie. Za achvotu supracoŭnictva ŭ „Stud. Trybunie" ščyra dziakujem. Z prysłanaha častku drukujem. Rešty nia možam nadrukavać dziela spoźnienaha času. Pišecie bolš.

Redakcyjnaja Kalehija „Studenskaj Trybuny" — u składzie kal. kal.: M. Tatarynovičanka, J. Šutovič i J. Malecki
Sekretaryjat „Stud. Trybuny" čynny kožnuju niadzielu miž 11—12 hadz. pry vul. Ludvisarskaj 1—19.